УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»

УДК 272-565.5/.6:782.28+398.332.12:7.031.2(476)

**РАМАНЕНКАВА
ВЕРАНІКА ІВАНАЎНА**

# РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЯ ПАСХАЛЬНАЯ ЦАРКОЎНАЯ І БЫТАВАЯ ТРАДЫЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ: МАСТАЦТВАЗНАЎЧАЯ РЭКАНСТРУКЦЫЯ

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата мастацтвазнаўства

па спецыяльнасці 17.00.09 – гісторыя і тэорыя мастацтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск, 2017

Праца выканана на кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік: | **Густова-Рунцо Ларыса Аляксандраўна,**<br>доктар мастацтвазнаўства, дацэнт,<br>дацэнт кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» |
| Афіцыйныя апаненты: | **Дадзіёмава Вольга Уладзіміраўна,**<br>доктар мастацтвазнаўства, прафесар, загадчык кафедры беларускай музыкі ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»<br><br>**Нячай Ганна Аляксандраўна**,<br>кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, дацэнт кафедры харавога і вакальнага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» |
| Апаніруючая арганізацыя: | **Дзяржаўная навуковая ўстанова «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»** |

Абарона адбудзецца 5 кастрычніка 2017 г. у 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 пры ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» па адрасе: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала бібліятэкі ўніверсітэта; e-mail: buk@buk.by; тэлефон вучонага сакратара 222-83-36.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

Аўтарэферат разасланы 1 верасня 2017 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт А.Я. Корсакава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

Аб'ектыўная карціна сучаснага мастацтва немагчымая без разумення таго, што рэлігія на працягу многіх стагоддзяў была "пажыўным асяроддзем" культуры, якая вызначала светапогляд мастакоў і мысліцеляў. Рымска-каталіцкая Царква за час існавання на беларускай зямлі аказала значны ўплыў на развіццё культуры і гісторыі краіны. Адной з устойлівых рэлігійных традыцый у Беларусі, якая абнаўляецца на працягу больш чым стагоддзя, з'яўляецца святкаванне хрысціянскай Пасхі. Пасха ў царкоўным і бытавым кантэксце мае аднолькавае семантычнае, але рознае мастацкае напаўненне.

Пасхальная царкоўная і бытавая традыцыі ўяўляюць сабой неад'емную частку сацыякультурнага жыцця пераважнай часткі насельніцтва Беларусі, а таксама з'яўляюцца складовым элементам беларускай нацыянальнай культуры. У айчынным і замежным мастацтвазнаўстве пасхальная традыцыя не стала прадметам навуковага аналізу, нягледзячы на тое што менавіта яна дала імпульс для сфарміравання хрысціянскага музычнага і выяўленчага мастацтва розных канфесій. Гэты факт вызначае актуальнасць дысертацыйнага даследавання.

Рымска-каталіцкая мастацкая традыцыя актыўна распаўсюджвалася па гістарычнай тэрыторыі сучаснай Беларусі з канца XIV ст. На працягу XIV – пачатку XVIII стст. мастацкая культура рымска-каталіцкай традыцыі паступова развівалася і заняла вядучае месца ў міжкультурным дыялогу; затым на працягу XIX – пачатку XX стст. пад уплывам сацыяльна-палітычных фактараў страціла гэтае значэнне. Рэлігійнае мастацтва і звычаі захоўваліся ў бытавым асяроддзі вернікаў. Дзякуючы гэтаму не знік духоўны патэнцыял беларускай культуры. На мяжы XX–XXI стст. рымска-каталіцкая мастацкая традыцыя стала паўнавартаснай часткай культуры беларускага грамадства, у тым ліку ўвайшла ў кола навуковых даследаванняў (працы Л. Касцюкавец, Т. Ліхач, У. Неўдаха).

Мастацкая культура рымска-каталіцкай традыцыі набыла рысы нацыянальнага характару пасля Другога Ватыканскага Сабора (1962–1965 гг.), які прызнаў дапушчальным і пажаданым выкарыстанне ў літургічнай практыцы лакальных мастацкіх традыцый і нацыянальнай мовы.

Супастаўленне царкоўнай і бытавой традыцый на аснове беларускіх рэлігійна-мастацкіх матэрыялаў у навуковым даследаванні праводзіцца ўпершыню ў беларускай і еўрапейскай навуцы. Суадносіны царкоўнай і бытавой традыцый праяўляюцца праз прынцыпы іх узаемадзеяння: прынцып захавання (тлумачыць інварыянтнасць канона ў царкоўнай традыцыі), прынцып замяшчэння (ўсталёўвае інтэрпрэтатыўны характар канона ў бытавой традыцыі), прынцып інтэграцыі (вызначае сінкрэтычны характар пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый).

Рымска-каталіцкая пасхальная царкоўная і бытавая традыцыі разглядаюцца праз сінтэз розных відаў мастацтва, дзе асноўнае месца займае аналіз агульнай структуры пасхальнай традыцыі ў мастацтве, у якім музыцы аддадзены прыярытэт, як аднаму з найважнейшых яе элементаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі**

Дысертацыйнае даследаванне выканана ў рамках комплексных навукова-даследніцкіх тэм кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў": "Кампаратывізм ў сучасным мастацтве як навуковы падыход і творчы метад" (зацв. на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 09.12.2006, заг. № 6), "Беларускае мастацтва XX ст. ва ўмовах глабалізацыі: кампаратыўны аналіз" (зацв. на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 21.12.2010, заг. № 4), "Інтэрпрэтацыя вобраза творчай асобы ў беларускім мастацтве XX–XXI стст.: кампаратыўны аналіз" (зацв. на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 22.12.2015, заг. №4). Дысертацыйнае даследаванне ажыццяўлялася ў кантэксце праграмы кафедры беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" "Песенная культура Беларусі як аснова выхавання нацыянальнай самасвядомасці моладзі ва ўмовах глабалізацыі" (зацв. на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 23.09.2009, заг. № 2), а таксама ў рамках задання К – 10 Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2011–2015 гады "Распрацаваць навуковае абгрунтаванне канцэпцыі ўзаемадзеяння мастацтваў. Стварыць інфармацыйны рэсурс "Мастацкі сінтэз і міжвідавая інтэграцыя мастацтваў у канцы XX – пачатку XXI стст.: тыпы, формы, структуры" (зацв. пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2010 г., № 1905).

Праблематыка дысертацыі адпавядае асноўным кірункам дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у галіне ідэалогіі і нацыянальнай культуры, якія адлюстраваны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Законе Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2001 г. "Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь" (рэдакцыя Закона ад 04.05.2012), законе Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 г. "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" (рэдакцыя Закона ад 08.05.2012).

**Мэта і задачы даследавання**

*Мэта* даследавання – выявіць асаблівасці развіцця рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый у Беларусі.

У адпаведнасці з мэтай даследавання намі былі пастаўлены наступныя *задачы*:

- вызначыць тэарэтычныя аспекты вывучэння рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый;
- акрэсліць значэнне і сэнс рымска-каталіцкай пасхальнай музычнай традыцыі ў беларускай мастацкай культуры;
- выявіць асноўныя прынцыпы ўзаемадзеяння рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый;
- паказаць сінтэз розных відаў мастацтва ў сучаснай беларускай рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцыях.

**Навуковая навізна даследавання**

Дысертацыя з'яўляецца першым спецыяльным даследаваннем па выяўленні асаблівасцяў развіцця рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый у Беларусі з пункту гледжання мастацтвазнаўства. У дысертацыйным даследаванні ўпершыню дадзена навуковае азначэнне паняцця "рымска-каталіцкая пасхальная традыцыя". Упершыню аўтарам асэнсоўваецца пытанне ўзаемадзеяння рымска-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый у Беларусі і вызначаюцца асноўныя прынцыпы ўзаемадзеяння гэтых традыцый: прынцып захавання, прынцып замяшчэння, прынцып інтэграцыі. Пасхальная царкоўная і бытавая традыцыі даследуюцца з пункту гледжання аб’ектывізацыі іх у творах мастацтва. Упершыню ў даследаванні паказаны сінтэз мастацтваў у пасхальных набажэнствах і бытавым асяроддзі беларускіх католікаў.

Навізна дадзенага даследавання складаецца як у самой пастаноўцы праблемы, так і ў сукупнасці прааналізаванага факталагічнага матэрыялу. Дысертацыя з’яўляецца першым даследаваннем на заяўленую тэму. У дадзенай працы ўпершыню ўзнята пытанне аб правамернасці сучаснай трактоўкі пасхальнай тэмы ў рымска-каталіцкай царкоўнай (літургічнай, пазалітургічнай) і бытавой практыках.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону**

1. Беларуская рымска-каталіцкая традыцыя ўяўляе сабой цэласную сістэму і мае дзве галіны ўвасаблення: царкоўную (літургічную, пазалітургічную) і бытавую. Рымска-каталіцкая пасхальная традыцыя – гэта комплекс абрадаў, мастацка-культурных каштоўнасцяў, навыкаў практычнай і грамадскай дзейнасці, якія аб’ядноўваюцца агульнай пасхальнай тэматыкай, заснаванай на канонах рымска-каталіцкай царквы. Рымска-каталіцкая пасхальная традыцыя з’яўляецца вобразна-семантычным увасабленнем падзеяў, звязаных з уваскрасеннем Хрыста. Пасхальная традыцыя фарміравалася і развівалася на працягу амаль двух тысячагоддзяў, а цяпер паўстае як феномен, які знаходзіцца ў працэсе бесперапыннага змянення, насычэння і дапаўнення. Асаблівасці пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый праяўляюцца ў працэсе творчай інтэрпрэтацыі кананічных тэкстаў у розных відах мастацтва.

2. Рымска-каталіцкая пасхальная музычная традыцыя, у аснове якой ляжаць кананічныя тэксты Святога Пісання, семантычна адлюстроўвае кананічны вобраз уваскрасення і аказвае ўздзеянне на фарміраванне ўсіх відаў рэлігійнага мастацтва. Пасхальная музычная традыцыя ўваходзіць у комплекс царкоўных набажэнстваў і бытавых абрадавых дзеянняў, носіць рытуальны характар і выступае як форма прэзентацыі малітоўных тэкстаў. Мастацкая пасхальная царкоўная і бытавая традыцыі з’яўляюцца асновай комплексу пасхальных набажэнстваў, якія складаюцца з перадпасхальнага Вялікага посту, пасхальнага Трыдыума і Актавы (васьмі дзён) пасля Пасхі. На аснове літургічнага цыклу пасхальнай царкоўнай традыцыі ў працэсе гістарычных і сацыякультурных трансфармацый адбылося станаўленне і развіццё бытавой пасхальнай традыцыі.

3. Рымска-каталіцкая пасхальная царкоўная і бытавая традыцыі ўзаемадзейнічаюць паміж сабой праз мастацкую творчасць. Асноўнымі прынцыпамі ўзаемадзеяння царкоўнай і бытавой традыцый з’яўляюцца: прынцып захавання (забяспечвае інварыянтнасць пасхальнага канона і нязменнасць формаў рытуальных дзеянняў у мастацкай царкоўнай і бытавой традыцыях), прынцып замяшчэння (забяспечвае варыятыўнасць пасхальнага літургічнага канона ў бытавой мастацкай традыцыі) і прынцып інтэграцыі (забяспечвае пранікненне элементаў бытавой мастацкай творчасці ў царкоўную практыку, а таксама насычае бытавое рэлігійнае мастацтва элементамі царкоўнай мастацкай творчасці).

4. Сучасная беларуская рымска-каталіцкая пасхальная царкоўная і бытавая традыцыі заснаваны на ўзаемадзеянні музычнага, тэатральнага, выяўленчага,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дэкаратыўна-прыкладнога мастацтваў, што праяўляецца ў скаардынаванасці іх праз паняційна-тэрміналагічнае, вобразна-семіятычнае і сюжэтнае адзінства. Сінтэз відаў мастацтва грунтуецца на іх акустычным (гук), аптычным (колер), вобразна-асацыятыўным (элементы тэатралізацыі) падабенстве, якое ўзнікае ў выніку агульнасці ўдзелу ўсіх элементаў пасхальнага набажэнтва ў мастацкай арганізацыі прасторы і часу пасхальных святкаванняў.

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыя выканана аўтарам у поўным аб'ёме самастойна. Вынікі даследавання ўносяць істотны ўклад у развіццё метадалогіі і гістарыяграфіі нацыянальнага мастацтвазнаўства. У дысертацыйным даследаванні рымска-каталіцкая пасхальная царкоўная і бытавая традыцыі як навуковая праблематыка даследавана ў шырокім гістарычным, культуралагічным (дыяхронны аспект даследавання) і геаграфічным (сінхронны аспект даследавання) кантэкстах – на матэрыяле сельскіх, гарадскіх і манастырскіх прыходаў усіх беларускіх рымска-каталіцкіх дыяцэзій. Аўтарам праведзена цэласнае даследаванне рымска-каталіцкай пасхальная мастацкай традыцыі і вызначаны, што музычнае мастацтва ў пасхальнай традыцыі займае пануючае месца. Праведзена тыпалагізацыя музыкі рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай (літургічная, пазалітургічная) і бытавой (рэлігійная, фальклорная) традыцый. Раскрыты характар адносінаў царкоўнай і бытавой традыцый ў беларускім рэлігійным мастацтве. У працэсе асабістай экспедыцыйнай работы па франтальнаму даследаванню рэгіёнаў Беларусі ў навуковы зварот уведзены значны факталагічны матэрыял, сабраны падчас 32 экспедыцый па парафіях рымска-каталіцкіх дыяцэзій Беларусі, а таксама па музеях і прыватных калекцыях. У выніку экспедыцый былі запісаны, прааналізаваны і абагульнены ўнікальныя аўдыё- і відэаматэрыялы.

Асабістым укладам з'яўляецца ўвядзенне вынікаў даследавання ў вучэбныя і практычныя курсы шляхам распрацоўкі некалькіх аўтарскіх методык па засваенню пасхальнай рымска-каталіцкай традыцыі.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыйнага даследавання**

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання былі апрабаваны падчас выступленняў на 25 навуковых і навукова-практычных канферэнцыях міжнароднага (20) і рэспубліканскага (5) ўзроўняў: IV, V, VIII, IX Міжнародных навукова-практычных канферэнцыях "Культура. Навука. Творчасць" (Мінск, 22–23 красавіка 2010 г., 27–28 красавіка 2011 г., 15 мая 2014 г., 05 мая 2015 г.); Міжнародных навуковых канферэнцыях "Актуальныя праблемы сусветнай мастацкай культуры" (Гродна, 25–26 мая 2010 г., 05–06 красавіка 2012 г., 16–17 кастрычніка 2014 г.); XXXV і XXXVI выніковых навуковых канферэнцыях студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў БДУКМ (Мінск, 29 верасня 2010 г., 18–19 красавіка 2012 г.); Міжнароднай студэнцкай канферэнцыі-семінары "Хрысціянства ў Еўропе: погляд у мінулае ці шлях у будучае" (Мінск, 10–12 снежня 2010 г.); VI, VIII, IX Міжнародных навуковых канферэнцыях "Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання" (Мінск, 27–29 красавіка 2012 г., 25–27 красавіка 2014 г., 24–26 красавіка 2015 г.); II і IV Міжнародных завочных навуковых канферэнцыях "Культура. Адкрыты фармат" (Мінск, 20 чэрвеня 2012 г., 15 чэрвеня 2014 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Хрысціянства і грамадства (да 1700-годдзя Міланскага эдыкта)" (Баранавічы, 17 мая 2013 г.); XIX–XXIII Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях, прысвечаных Дням славянскай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пісьменнасці і культуры (Мінск, 22–24 мая 2013 г., 20 мая 2014 г., 21–23 мая 2015 г., 25–27 мая 2016 г., 23–25 мая 2017 г.); Рэспубліканскай навукова-творчай канферэнцыі “VII Няфёдаўскія чытанні «Беларускае мастацтва: гісторыя і сучаснасць»” (Мінск, 3 красавіка 2014 г.); I Міжнароднай навуковай канферэнцыі памяці Ядзвігі Дамінікаўны Грыгаровіч “Асоба ў кантэксце сучасных сацыякультурных працэсаў” (Мінск, 12 лістапада 2014 г.); Навуковай канферэнцыі прафесарска-выкладчыцкага складу, прысвечанай 40-годдзю заснавання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў “Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва: інавацыйныя падыходы” (Мінск, 25 лістапада 2015 г.); Другіх беларускіх калядных чытаннях “1917–2017. Праваслаўе ў гісторыі і культуры Беларусі: вынікі стагоддзя”; канферэнцыі “Царква і культура. Традыцыя і дыялог” (Мінск, 2 снежня 2016 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўныя вынікі даследавання прадстаўлены ў 19 навуковых публікацыях: 3 артыкулы ў рэцэнзуемых навуковых часопісах (1.1 аўт. а.), 6 артыкулы у зборніках навуковых артыкулаў (1.54 аўт. а.), 10 артыкулаў – у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый (2,63 аўт. а.). Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў па тэме дысертацыі складае 5,27 аўт. а.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Структура работы абумоўлена логікай матэрыялу і складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох раздзелаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу, 9 дадаткаў.

Поўны аб’ём дысертацыі займае 256 старонак. Асноўны тэкст выкладзены на 133 старонках. Бібліяграфічны спіс займае 28 старонак і складаецца са спісу выкарыстаных крыніц (295 крыніц на беларускай, рускай, украінскай, англіскай, італьянскай, лацінскай, польскай мовах) і спісу публікацый саіскальніка (19 крыніц на беларускай мове). Дадаткі займаюць 74 старонкі: слоўнік тэрмінаў і персаналіяў; расшыфроўкі інтэрв’ю; табліцы; сцэнарый тэатральнай пастаноўкі; фотаматэрыялы; тэкставыя (нотны і паэтычны) матэрыялы; аўдыё- і відэаматэрыялы; спіс носьбітаў рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый, якія прымалі ўдзел у даследаванні; спіс даследуемых парафій.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Ва ўводзінах і агульнай характарыстыцы работы** аргументаваны выбар тэмы даследавання, яе актуальнасць, абгрунтавана сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі, вызначаны мэта і задачы даследавання, прапанаваны асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, адзначаны асабісты ўклад саіскальніка і адлюстравана апрабацыя вынікаў даследавання, колькасць апублікаваных работ, структура і аб’ём дысертацыі.

**Раздзел першы “Рымска-каталіцкая царкоўная і бытавая традыцыі: гісторыка-тэарэтычныя асновы даследавання”** уключае ў сябе дзве часткі і прысвечаны аналізу навуковых крыніц, метадалогіі і метадам даследавання, а таксама тэарэтычнаму асэнсаванню паняцця рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый і яго фарміравання ў рамках культурна-гістарычнага развіцця Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***У падраздзеле 1.1 “Рымска-каталіцкая пасхальная традыцыя ў кантэксце аналітычнага агляду літаратуры. Метадалогія даследавання”*** разглядаюцца розныя навуковыя працы, якія склалі метадалогію дысертацыйнага даследавання рымска-каталіцкай пасхальнай мастацкай царкоўнай і бытавой традыцый у Беларусі.

Рымска-каталіцкая пасхальная традыцыя складаецца з рэлігійных абрадаў і народных звычаяў, звязаных з галоўным хрысціянскім святам Пасхі. Пасхальнай тэме прысвечана невялікая колькасць спецыяльных прац, аўтарамі якіх з’яўляюцца: Г. Гарчыцкі, С. Іванова, М. Сардзійскі, Е. Хінц, Ю. Яцкоўскі. Гэтыя навукоўцы раскрылі значэнне пасхальнага набажэнства, абазначылі сэнс, які закладзены ў кожным пасхальным абрадзе.

Станаўленне і развіццё рымска-каталіцкай пасхальнай мастацкай традыцыі ў Беларусі адбывалася ў непарыўнай сувязі з фарміраваннем агульнакультурнай мастацкай прасторы. Метадалагічнай асновай даследавання царкоўнай традыцыі сталі працы гісторыкаў і мастацтвазнаўцаў В. Апеля, П. Броўна, Г. Гарчыцкага, М. Кунцлера, Ж.-М. Люстыжэ, У. Мартынава, Б. Мэндліка, Г. Піхуры, С. Пэрыша, П. Рымскага, А. Рэамэнзіса, Э. Уілсан-Дзікенса, Ю. Халопава, Дж. Харпэ, Э. Хінца, М. Хлопава, С. Шчэпанца, М. Шчэпанкевіча, М. Шуліка, Н. Яфімавай. Метадалагічнай базай для вывучэння гістарычнага развіцця беларускай рымска-каталіцкай бытавой мастацкай традыцыі сталі працы карыфеяў этнамузыкалогіі і фалькларыстыкі П. Бяссонава, Т. Варфаламеевай, Я. Гіпіус, І. Казаковай, М. Ларчанка, А. Ліса, З. Мажэйкі, М. Равенскага, П. Шэйна, В. Ялатава, якія дапоўнілі навуковыя тэарэтыка-аналітычныя крыніцы, створаныя супрацоўнікамі Інстытута музыкалогіі Каталіцкага ўніверсітэта ў Любліне (Польшча) А. Зола, Я. Мроўцам. Класіфікацыя бытавой традыцыі і характарыстыка яе асаблівасцяў выканана на аснове навуковых прац Б. Барткоўскага, Л. Густовай, В. Данілевіча, А. Золы, Л. Касцюкавец, Т. Ліхач, У. Неўдаха. Інтэграцыя мастацтваў у пасхальнай традыцыі прасочваецца дзякуючы распрацоўкам даследчыкаў у галіне культуралогіі (А. Павільч) і кампаратыўнага мастацтваўзнаўства (Дз. Брыткевіч, В. Пракапцовай).

Тэарэтычная база даследавання рымска-каталіцкай пасхальнай традыцыі грунтуецца на працах мастацтвазнаўцаў (І. Алексінай, Б. Асаф’ева, А. Аўчыннікава, А. Джывелегава, А. Лазарава, У. Няфёда, Я. Сахуты, А. Сохара, Ю. Халопава), культуролагаў (М. Захарчанка, С. Парашкова, А. Пытляка, Ш. Эйзенштадта), эстэтыкаў і сацыёлагаў (Л. Борсук, Р. Грубера, Э. Дубянецкага, У. Конана, С. Лур’е, Л. Уладыкоўскай), філосафаў і тэолагаў (М. Карзо, А. Карташова, А. Лебедзева, Д. Омэна).

Беларуская рымска-каталіцкая пасхальная царкоўная і бытавая традыцыі ўяўляюць сабой цэласны аб’ект, што патрабуе выкарыстання комплекснага падыходу да іх даследавання. Для ажыццяўлення пастаўленых задач выкарыстаны агульнанавуковыя метады даследавання. На аснове аналізу і сінтэзу навуковых крыніц, супастаўлення і абагульнення асноўных ідэй і тэорый, была вызначана канцэпцыя і метадалогія даследавання, якая дазволіла разгледзіць рымска-каталіцкую пасхальную царкоўную і бытавую традыцыі як феномен беларускай культуры. Метады абстрагавання, індукцыі і дэдукцыі спрыялі пераходу ад сабраных аўтарам эмпірычных дадзеных да мастацтвазнаўчай рэканструкцыі рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый. На аснове гэтых тэарэтычных і навукова-практычных метадаў быў паказаны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сінтэз розных відаў мастацтва ў сучаснай беларускай рымска-каталіцкай царкоўнай і бытавой пасхальнай традыцыіі, раскрыта іх узаемасувязь.

Даследаванне рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый патрабуе міждысцыплінарнага вывучэння праблемы, а таксама выклікае неабходнасць выкарыстання метадалогіі сумежных навук і адпаведных спецыяльных метадаў – сістэмнага, іканалагічнага, гістарыяграфічнага, культуралагічнага, мастацтвазнаўчага і кампаратыўнага аналізу а таксама сукупнасці метадаў палявых даследаванняў.

Сістэмны метад для даследавання рымска-каталіцкай пасхальнай традыцыі дазволіў класіфікаваць аб'ёмны эмпірычны матэрыял (шматлікія назіранні, праведзеныя ў Віцебскай, Гродзенскай, Мінска-Магілёўскай і Пінскай дыяцэзіях, інтэрв'ю і анкетаванне суб'ектаў і рэцыпіентаў Рымска-каталіцкай Царквы) і прааналізаваць складовыя элементы рэлігійнага мастацтва ў іх узаемасувязі. Іканалагічны метад дапамог раскрыць вобразна-сімвалічны змест твораў мастацтва царкоўнай і бытавой традыцый, даў магчымасць інтэрпрэтаваць вербальны, візуальны і аўдыяльны мастацкі вобраз. Гістарыяграфічны метад дазволіў раскрыць асаблівасці станаўлення і развіцця рымска-каталіцкай традыцыі. Уздзеянне сацыяльна-палітычных і агульнакультурных фактараў на развіццё рымска-каталіцкай пасхальнай мастацкай традыцыі вызначыла прымяненне культуралагічнага метаду.

***У падраздзеле 1.2 "Фарміраванне і развіццё царкоўнай і бытавой традыцый у Беларусі"*** абгрунтоўваецца сэнсавае напаўненне царкоўнай і бытавой традыцый, вызначаецца значэнне музыкі ў пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцыях у кантэксце яе гістарычнага развіцця, абазначаецца ступень сацыякультурных уплываў на фарміраванне і развіццё рымска-каталіцкай царкоўнай і бытавой традыцый.

Рымска-каталіцкая пасхальная традыцыя – гэта трывалая мастацка-культурная з'ява, якая носіць комплексны характар і грунтуецца на сюжэтах пасхальнай тэматыкі. Рымска-каталіцкая пасхальная традыцыя знаходзіцца ў працэсе бесперапыннага змянення, насычэння і дапаўнення. Мастацка-культурны комплекс пасхальнай традыцыі злучае музычнае, выяўленчае, тэатральнае мастацтва, якія аб'яднаны адзінай вобразнай семантыкай і сюжэтным развіццём. Рымска-каталіцкая пасхальная традыцыя ўключае ў сябе царкоўны і бытавы кампаненты. Рымска-каталіцкая пасхальная царкоўная традыцыя прадстаўлена літургічным (заснаваным на кананічных тэкстах, прызначаных для богаслужбовай практыкі) і пазалітургічным (заснаваным на варыянтнасці канона, яго спецыфічнай інтэрпрэтацыі ў рамках літургіі) відамі. Бытавая пасхальная традыцыя знаходзіць выражэнне ў дастаткова свабоднай кампаноўцы канона ў паўсядзённым жыцці. Царкоўная і бытавая традыцыі стварылі своеасаблівую цэласную структуру, узаемадзеянне паміж якімі, забяспечвае іх самазахаванне з аднаго боку, гарантуючы ўнутраную ўстойлівасць хрысціянства; гнуткасць і здольнасць да адаптацыі ў розных умовах бытавой традыцыі з другога боку.

Паводле дакументаў Другога Ватыканскага Сабору ў царкоўнай традыцыі галоўным відам мастацтва ў літургіі з'яўляецца музыка. Царкоўная рымска-каталіцкая традыцыя прадстаўлена літургічнай музыкай (меса (Імша, як музычны твор), секвенцыя, рэспансорый, літургічная песня) і пазалітургічнай музыкай (канты, рэлігійныя песні, прымеркаваныя для выканання падчас працэсій, пілігрымак, адарацый, чуванняў). Літургічная і рэлігійная песні адрозніваюцца функцыямі і месцам выканання. У бытавой

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пасхальнай музычнай традыцыі найбольш устойлівымі і папулярнымі музычнымі жанрамі выступаюць духоўныя вершы, валачобныя песні, поставыя песні.

Літургічная музыка прымеркавана да набажэнстваў і выступае як форма прэзентацыі малітоўных тэкстаў. Фарміраванне літургічнай музыкі рымска-каталіцкай традыцыі адбывалася разам з развіццём каталіцкай літургіі і багаслоўя, што знайшло адлюстраванне у трактатах філосафаў.

Для фарміравання царкоўнай музычнай традыцыі вялікае значэнне мелі антычныя эстэтычныя (Арыстаксэнас, Арыстыд, Платон) і сярэднявечныя багаслоўскія (Амброзій Медыяланскі, Аўгустын, Баэцый) погляды на музыку. Першапачатковае станаўленне заходняй царкоўна-спеўнай культуры ішло шляхам дыялогу з богаслужбовымі спевамі ўсходняга тыпу. Зліццё ў літургічнай музыцы старажытных візантыйскіх, рымскіх і іншых спеўных традыцый знайшло ўвасабленне ў так званым амбрасіянскім харале – першай трывалай і распаўсюджанай форме рымска-каталіцкага літургічнага спеву.

Афіцыйна зацверджанай і дакументальна зафіксаванай формай царкоўнай музыкі рымска-каталіцкай традыцыі стаў грыгарыянскі харал – літургічная манодыя з дастаткова свабодным рытмам. Сярэднявечныя царкоўныя музыканты (Алкуін, Аўрэліян, Беда Дастойны, Геранім, Гвіда з Арэцца) сістэматызавалі і развілі музычныя тэксты грыгарыянскага харалу, распрацавалі сістэму яго натацыі. Трактаты эпохі Адраджэння (Вічэнцін, Гафурыус, Грахеа, Кохлеус) вызначаюць ступень развіцця шматгалосся і царкоўнага інструментарыя ў богаслужбовай музыцы Рымска-каталіцкай Царквы, а таксама апісваюць працэс удасканалення кампазітарскіх прыёмаў і сродкаў выканання. У гэты ж час І. Грахеа была прапанавана новая для таго часу сістэматызацыя музыкі: музыка простая ці грамадская (бытавая, народная); музыка складаная, якая ствараецца “па правілах” (аўтарская); музыка царкоўная. Адсюль вынікае, што гэта была першая метадалагічна асэнсаваная і пацверджаная спроба тэарэтычнага размежавання царкоўнага і бытавога музычнага мастацтва. У эпоху Асветы Э. Ганслік і інш. пачынаюць разглядаць музыку як асаблівую форму духоўнай дзейнасці, функцыянальнаю адзінку агульнай мастацтвазнаўчай або фалькларыстычнай, культуралагічнай ці гістарычнай навук, супрацьпастаўляючы яе ўсім іншым відам мастацтва.

Фарміраванне кананічнай музычнай традыцыі адлюстравана ў дакументах Рымска-каталіцкай Царквы, якія ўключаюць у сябе ўсе тэарэтычныя аспекты царкоўнай музыкі. У 1963 г. адбылася музычна-літургічная рэформа, якая ўстанавіла сучасны парадак і састаўныя часткі заходняй літургіі. Пазнейшыя дакументы аб музыцы рымска-каталіцкай традыцыі ўдасканальваюць яе функцыі на літургіі і па-за літургіяй (“З уласнай волі” (лац. “Motu proprio”) выдадзены святым Піем Х у 1903 г., і “Сакральная музычная навука” (лац. “Musica sacra disciplina”), выдадзены Піем ХІІ у 1955 г.).

Літургічная музыка ад вытокаў свайго фарміравання мела непарыўную сувязь з пазалітургічнай музыкай (спевы з рэлігійнымі тэкстамі, якія функцыянуюць па-за літургічнай абраднасцю ў канкрэтных сітуацыях царкоўнага каляндара). Абапіраючыся на тэрміналогію І. Гарднэра, Л. Густовай, О. Зосім у даследаванні ўжываецца тэрмін “пазалітургічная музыка”. Асноўнымі крытэрыямі адрознення літургічнай музыкі ад пазалітургічнай з’яўляюцца тэкст, мелодыка, спосаб і кантэкст выканання. Пазалітургічная музыка па змесце і сутнасці грунтуецца на канонах Рымска-каталіцкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Царквы, але тэкст і мелодыя пазалітургічных песень, часам, змяняюцца ў бок спрашчэння і дакладнага разумення вернікамі сэнсу кананічных тэкстаў.

Значэнне пазалітургічнай музыкі, яе прысутнасць у рэлігійнай практыцы вернікаў неаднаразова абмяркоўвалі на Сусветных саборах (III Таледскі 589 г., Канстанцінопальскі 692 г., Трыдэнцкі, 1499–1565 гг., І Ватыканскі, 1869–1870 гг., II Ватыканскі 1962–1965 гг.) і іншых афіцыйных царкоўных дакументах. Напрыклад, Папа Пій XII у энцыкліцы аб сакральнай музыцы (лац. “Encyklika musicae sacrae disciplina”, 1955 г.) звярнуў увагу на тое, што трэба цаніць народную музыку, якая прыносіць значную карысць для рэлігійнага жыцця вернікаў, дзякуючы чаму можа называцца “рэлігійнай музыкай”. У 1955 г. народную рэлігійную музыку (пасля адаптацыі тэксту, мелодыкі, спосабаў гукавядзення) афіцыйна прынялі ў літургічны абіход. Яна склала асобны жанр, які мае назву “пазалітургічная музыка”. Аб прысутнасці ў хрысціянскім жыцці католікаў у Беларусі пазалітургічнай музыкі сведчасць музычныя літургічныя зборнікі рымска-каталіцкіх парафій Віцебскай і Гродненскай дыяцэзій, напрыклад, “Кантычка, або Набожныя песні” (пол. “Kantyczka czyli Pieśni nabożne”) 1885 г., “Касцёльныя песні” (лац. “Cantus ecclesiastici”) 1911 г., “Рымска-каталіцкі касцёльны Канцыянал” (лац. “Cantionale Ecclesiasticum Romano-catholicicum”) 1862 г., у якіх змяшчаюцца ноты і тэксты як літургічных, так і пазалітургічных песень.

Жанрамі пазалітургічнай музыкі рымска-каталіцкай традыцыі ў Беларусі з’яўляюцца: рэлігійная песня (асноўны жанр), кант або псальм і духоўны верш, які толькі эпізадычна прысутнічае ў музычнай (пераважна бытавой) практыцы католікаў некаторых парафій у Беларусі. Рэлігійная песня тэматычна звязана з літургічным календаром. Для рэлігійнай песні характэрны тэкст з рэлігійным зместам, які часцей за ўсё мае страфічную форму і зручныя рэфрэны. Рэлігійныя песні могуць выконвацца як у царкве, так і па-за яе межамі (у бытавым асяроддзі з аднолькавымі малітоўнымі функцыянальнымі мэтамі). Гэта выснова падмацоўваецца фактамі наяўнасці амаль у кожнай сучаснай вясковай хаце рэлігійнага спеўніка “Кантычка, або Песні набожныя”.

Каталіцкія рэлігійныя песні былі вельмі папулярнымі на беларускіх землях у XVI–XVII стст. Іх распаўсюджванню спрыяла з’яўленне новых рэлігійных цырымоній і набажэнстваў – “Набажэнства малітвы на святым ружанцы”, “Крыжовы шлях”, “Працэсія Божага Цела” і г. д. спецыяльна для “новых” набажэнстваў складаліся песні на нацыянальных мовах.

Бытавая рымска-каталіцкая пасхальная мастацкая традыцыя ў Беларусі прадстаўлена вялікай колькасцю валачобных песень (“А на моры хісткая кладка”, “Ай, на дварэ”, “Абвіты чыстай плашчаніцай”, “Вялік сьвятой нам дзень настаў”, “На першы дзень Вяліканьня”, “Як была земля да не хрышчаная” і г. д.), якія характарызуюцца багатым зместам, паэтычнай і музычнай дасканаласцю, выразнай функцыянальнасцю, устойлівай страфічнай і метрарытмічнай структурай.

Развіццё беларускай рымска-каталіцкай царкоўнай і бытавой пасхальнай традыцый адбывалася ў кантэксце гістарычна-культурнага працэсу развіцця краіны. Цесныя ўзаемасувязі мясцовай беларускай, польскай і рускай рэлігійных культур у Беларусі і іх узаемаўплыў ва ўлонні рымска-каталіцкай царкоўнай і бытавой традыцый адлюстроўвае падзеі і перажыткі мінулага ў рэлігійным мастацтве гэтых краін, звычаях, абрадах, народным побыце і свядомасці сучасных беларусаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Раздзел другі “Увасабленне пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый у беларускай мастацкай культуры”** ўключае ў сябе два параграфы і прысвечаны характарыстыцы пасхальнай мастацкай традыцыі ў літургічным рымска-каталіцкім цыкле; паказу працэсу трансфармацыі літургічнай музыкі і яе адаптацыі ў бытавым асяроддзі.

***У падраздзеле 2.1 “Кананічны інварыянт пасхальнай традыцыі ў рымска-каталіцкім літургічным цыкле”*** раскрыты этапы фарміравання рымска-каталіцкага пасхальнага літургічнага цыклу, адзначана кананічная інварыянтнасць пасхальнай традыцыі ў літургіі, вызначана семантычнае значэнне кожнага структурнага элемента пасхальнай літургіі ў кантэксце яго мастацкага ўвасаблення ў музыцы і ў выяўленчым мастацтве.

Пасха, або Вялікдзень, або Змёртвыхпаўстанне Хрыста – галоўнае свята літургічнага года рымска-каталіцкай традыцыі. Фарміраванне структуры пасхальнага літургічнага цыклу пачалося ў 325 г. на Нікейскім Саборы. Да XIII–XIV стст. склаліся галоўныя часткі літургічнага спеўнага цыклу, кананічныя вобразы і форма тэатралізацыі літургіі. Яны былі дзейснымі да Другога Ватыканскага Сабора, які замацаваў галоўныя каноны і парадак Імшы сучаснай Рымска-каталіцкай Царквы.

Пасхальны літургічны цыкл складаецца з трох асноўных перыядаў: Вялікі пост; пасхальны Трыдыум (Вялікі чацвер, Вялікая пятніца, пасхальная Вігілія); пасхальная Актава (святочны пасхальны тыдзень), якая працягваецца велікодным перыядам і заканчваецца на 50-ты дзень пасля ўваскрасення Хрыста ў свята Спаслання Святога Духа. У гэтых частках пасхальнага цыклу пры дапамозе розных відаў мастацтва сімвалічна ўвасабляецца евангельскі тэкст аб пакутах, смерці і ўваскрасенні Хрыста, тлумачыцца духоўны сэнс і значэнне гэтых падзей для хрысціяніна і чалавецтва ў цэлым.

Першай часткай пасхальнага літургічнага цыклу з’яўляецца Вялікі пост – час падрыхтоўкі да святкавання Пасхі. У гэты перыяд змяняецца музычнае суправаджэнне літургіі (не выкарыстоўваюцца ўрачыстыя і радасныя спевы, напрыклад, такія як “Альлелюя”, гімн “Хвала на вышынях Богу”), змяняецца дэкаратыўнае афармленне храмаў, колер адзення святароў. Гэта адбываецца таму, што неабходна ўнесці змены ў эмацыянальнае ўспрыняцце вернікамі літургічнага цыклу.

Вялікі пост з 1570 г. распачынаецца Папяльцовай серадой. У літургію Папяльцовай серады ўключаны дадатковы абрад, напоўнены знакамі, якія выступаюць сродкам тэатралізацыі (святар пасыпае галовы вернікаў попелам; вернікі, выходзячы з Касцёла сваімі крыжамі, прынесенымі з дому, дакранаюцца да “ўваходнага” крыжа).

Для перыяду Вялікага посту характэрны яшчэ адзін значны тэатралізаваны элемент: “Крыжовы шлях” – набажэнства і вобразная візуалізацыя пакут Хрыста. Крыжовы шлях суправаджаецца экспрэсіўнымі традыцыйнымі спевамі (“Які за нас цярпеў ад ранаў”, “Бачыш, Езу канае” і інш.). Яшчэ адной формай мастацкай пасхальнай традыцыі ў Беларусі з’яўляецца пакутнае набажэнства “Песні жальбы” – песні, у тэкстах якіх закладзена гісторыя пакут і смерці Ісуса Хрыста.

Паступова з усталяваннем названага набажэнства адбывалася і візуалізацыя падзеі мукі Хрыста, якая праявілася ў выяўленчым (іканапісе, станкавым жывапісе) і дэкаратыўна-прыкладным (разьбе па дрэве) мастацтве. З XVII ст. ўвасабленне пакутаў Хрыста ў выяўленчым мастацтве стала абавязковым атрыбутам упрыгожвання рымска-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каталіцкай царквы. Іх размяшчалі на сценах і пілонах храмаў па ходзе стрэлкі гадзінніка, пачынаючы ад галоўнага алтара.

Старажытныя абразы з выявамі стацый (14 традыцыйных вобразаў крыжовай дарогі Хрыста) у беларускіх каталіцкіх храмах амаль не захаваліся, іх можна сустрэць толькі эпізадычна або ў дакументах, нарысах ці апокрыфах мінулых гадоў. Візітацыя Віленскай дыяцэзіі 1653–1654 гг. указвае на тое, што ў дзятлаўскім касцёле (1646 г.) сцены храма былі ў роспісах: “абразоў на сценах, на муры маляваных – 10, але ўжо ад муру паадставалі і паападалі”. З ацалелых Крыжовых стацый найбольш раннімі можна лічыць барэльефы з другой паловы XVIII ст. у гродзенскім па-бернардынскім касцёле Узвышэння Святога Крыжа.

Кульмінацыяй Вялікага посту з’яўляецца так званы “Вялікі тыдзень”, у склад якога ўваходзіць Пальмавая нядзеля і Пасхальны Трыдыум са спецыяльнымі набажэнствамі. Падчас гэтых набажэнстваў адбываецца ўзмацненне эмацыйнага ўздзеяння на вернікаў пры дапамозе аўдыяльных і візуальных сродкаў выразнасці: фанфарнае гучанне аргана і званоў (у Вялікі чацвер гімн “Хвала на вышынях Богу” ), сімвалічная цішыня (у Вялікі чацвер пасля гэтага гімна), выкарыстанне сухога гуку драўляных калатушак у якасці сігнальнага інструмента, інсцэнізацыя Крыжовага шляху ў суправаджэнні спеву а cappella (у Вялікую Пятніцу).

Цэнтрам рымска-каталіцкай пасхальнай традыцыі з’яўляецца пасхальная Імша, для якой характэрна тэатралізацыя абраду з інтэнсіўным візуальным (выкарыстанне агня, максімальнае асвятленне памяшкання храма) і аўдыяльным (рознапланавыя па стылістыцы музычныя творы з вялікай колькасцю меладычных і інтанацыйных упрыгожванняў гуку, фанфарныя інтанацыі ў інструментальным акампанеменце, гучанне усіх званоў) напаўненнем. Падобныя мастацкія прыёмы выкарыстоўваюцца і ў дэкоры храмаў: насычаная каляровая гама з перавагай чырвонага, белага і жоўтага колераў у фларыстычных кампазіцыях, дэкаратыўным афармленні Касцёлаў і ў адзенні святароў; маштабнасць формаў; аздабленне ўсіх твораў мастацтва спецыяльнай пасхальнай сімволікай. Пасхальны літургічны цыкл узбагачаецца распаўсюджанай формай пазалітургічнага набажэнства – чуваннем у пасхальную ноч, калі спяваюцца велікодныя, эўхарыстычныя і іншыя песні у суправаджэнні музычных інструментаў (гітары, скрыпкі, аргана і інш.) або а cappella. Кодай пасхальнага літургічнага цыклу з’яўляецца дзень Спаслання Святога Духа. У гэты дзень апошні раз у годзе гучаць пасхальныя спевы.

Кампазітары і музычныя творцы-аматары стварылі вялікую колькасць твораў прымеркаваных пасхальным набажэнствам. Напрыклад, некаторыя кампазіцыі, што выконваюцца ў беларускіх касцёлах: харавая песня “Аллілюя, слаўце Бога”, васьміганосная меса, “Пасіі” Вацлава з Шамотул (1546 – 1560 гг.), харавая песня “Уваскрос Укрыжаваны” (лац. Crucifixus surrexit) А. Рагачоўскага (Пельплінская табулатура XVIII ст.), пасхальная Меса Г. Гервазы, “Гэта ёсць дзень” (гімн з літургіі гадзінаў, музыка А. Гоузэс (Andre Gouzes OP) і інш. Да сучаснай беларускай літургічнай кампазітарскай школы можна аднесці такіх творцаў як: А. Безынсон, В. Капыцька, В. Кісцень, А. Літвіноўскі, Я. Паплаўскі, Г. Смоляк, В. Шмат, І. Хадоска і інш.

Пасхальная тэматыка ўвасабляецца ў выяўленчым мастацтве рымска-каталіцкай традыцыі. У выніку даследавання устаноўлена, што на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў рымска-каталіцкіх парафіях не зафіксавана ні адной алтарнай іконы прысвечанай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уваскрасенню Хрыста. Як асобныя іконы, якія аздабляюць бакавыя сцены касцёлаў, пасхальныя абразы сустракаюцца рэдка. Але выявы з Уваскрослым Хрыстом прысутнічыюць у зборах Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Музеі старажытнага беларускага мастацтва Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь і некаторых прыватных калекцый, напрыклад збор І. Сурмачэўскага. Такая стрыманасць ва ўзорах пасхальнага іканапісу рымска-каталіцкай традыцыі звязана з тым, што станаўленне і развіццё каталіцкага мастацтва і каталіцкай веры на тэрыторыі Беларусі прыйшлося на XVII–XVIII стст., калі актыўна развіваўся культ Дзевы Марыі і святых у гонар якіх будавалі святыні прадстаўнікі тых ці іншых манасскіх супольнасцяў. Але некаторыя ўзоры пасхальнага мастацтва прадстаўлены ў так званым народным іканапісе.

***У падраздзеле 2.2 “Асаблівасці адаптацыі кананічнай пасхальнай традыцыі ў рымска-каталіцкай бытавой культуры”*** звяртаецца ўвага на ўвасабленне кананічнай пасхальнай традыцыі ў бытавым асяроддзі. Да рымска-каталіцкай бытавой пасхальнай традыцыі адносяцца фальклорныя абрады (валачобны) і звычаі (гульні з велікоднымі яйкамі, звычай памінання продкаў), аб’яднаныя агульнай пасхальнай ідэяй, сюжэтам, зместам.

Бытавая і царкоўная традыцыі святкавання Пасхі (Вялікадня, Вялікання, Вельканоцы) у Беларусі цесна звязаны. У бытавым асяроддзі беларускіх католікаў Вялікдзень з’яўляецца самым “рэлігійным” святам, дзе ў большай ступені пануе пэўная раўнавага паміж царкоўнымі і бытавымі традыцыямі. Пасхальная царкоўная і бытавая традыцыі маюць агульныя карані святкавання і строгую паралельнасць абрадаў. Але існуе адно адрозненне: згодна з царкоўнай традыцыяй Вялікі пост пачынаецца Папяльцовай серадой, а згодна з бытавой традыцыяй, Вялікаму посту папярэднічае Масленічны тыдзень, які ў католікаў пачынаецца ў чацвер і заканчваецца ў Папяльцовую сераду.

Цэнтральная частка бытавой рымска-каталіцкай пасхальнай традыцыі – гэта святочная сямейная трапеза. Важным момантам у велікодныя дні з’яўляецца валачобны абрад – рытуальны абыход двароў валачобнікамі з песнямі, якія не маюць аналагаў у культурах суседніх народаў (А. Ліс). Устаноўлена, што на тэрыторыі Беларусі існавала традыцыя пераапранання валачобнікаў у звяроў (мядзведзя, бусла і інш.). У адрозненне ад іншых рэгіёнаў Беларусі ў Заходнім Паазер’і пад моцным каталіцкім уплывам назіраецца больш рэлігійны змест тэкстаў валачобных песень і адсутнасць пераапранання ў звяроў і птушак. Ва ўсходняй частцы Беларусі (поўдзень Віцебскай і Магілёўскай абласцей), наадварот, пасхальныя бытавыя песні моцна фальклярызаваныя і суправаджаюцца тэатралізаванымі прадстаўленнямі.

Кожнае рытуальнае дзеянне на Пасху ў бытавым асяроддзі суправаджаецца спецыяльнымі спевамі, гульнямі. Валачобныя песні родныя калядкам, што праяўляецца праз: аднолькавую сэнсава-змястоўную прымеркаванасць; падобную тэматыку “філасофіі дароў” у паэтычных тэкстах; аднолькавасць меладычнай будовы і рэспансорны спосаб выканання; сімвалічны код вярбальных тэкстаў (постаці святых, вобразы жыта, золата); антрапацэнтычнасць Бога і Святых; насычэнне фальклорнай паэтыкі кананічнымі літургічнымі выразамі (“Хрыстос Уваскрос!”, “Аллелюя!” і інш.). Характэрнымі прыкметамі рэлігійнага фальклору пасхальнай рымска-каталіцкай традыцыі з’яўляюцца: біфункцыянальнасць (што азначае непарыўнае адзінства

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

практычнай і духоўнай функцыі фальклорнага твора. Напрыклад, песні, якія спяваюцца на пахаваннях або на чуваннях пры гробе Хрыста ў ноч Вялікай пятніцы выконваюць практычную функцыю псіхалагічнай абароны асобы), поліэлементнасць або сінкрэтызм, выканальніцкая варыятыўнасць, калектыўнасць, featureзнае музычнае інтанаванне царкоўных і бытавых песень.

Галоўным атрыбутам пасхальнай традыцыі ў бытавым асяроддзі хрысціян з'яўляецца чырвонае яйка. Пасхальныя яйкі фарбавалі ў адзін колер і тады іх называлі "крашанкі", або яйкі аздаблялі малюнкамі, карункамі і тады іх называлі "пісанкамі". Дэкарыраваны малюнак на пасхальных "пісанках" мог быць прадстаўлены ў формах хваляў (сімвал вады), ромбаў (сімвал узыходу і заходу сонца), плаўных ліній ў выглядзе рыбы (сімвал хрысціянства).

Адным з самых устойлівых комплексаў у сістэме велікоднага перыяду бытавой традыцыі з'яўляецца звычай памінання продкаў. Бытавая пасхальная рымска-каталіцкая традыцыя знайшла сваё ўвасабленне ў шэрагу жанраў народнага мастацтва: вышыванках, пісанках, дэкаратыўных упрыгожаннях святынь, драўлянай і каменнай скульптуры.

**Раздзел трэці "Актуалізацыя сучаснай пасхальнай мастацкай царкоўнай і бытавой традыцый"** уключае ў сябе тры параграфы. Гэты раздзел прысвечаны вызначэнню і раскрыццю асноўных прынцыпаў узаемадзеяння пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый. У раздзеле паказаны сінтэз розных відаў мастацтва, а таксама раскрыты кірункі пераемнасці і наватарства пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый.

***У падраздзеле 3.1 "Асноўныя прынцыпы ўзаемадзеяння пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый"*** вызначаюцца прынцыпы ўзаемадзеяння рымска-каталіцкай царкоўнай і бытавой традыцый у межах пасхальных святкаванняў. Узаемадзеянне рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый ажыццяўляецца ў двух кірунках: засваенне пасхальных рэлігійных канонаў бытавой традыцыяй і інтэрпрэтацыя элементаў бытавой творчасці ў царкоўнай традыцыі. Асноўнымі прынцыпамі ўзаемадзеяння пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый з'яўляюцца: прынцып захавання, прынцып замяшчэння і прынцып інтэграцыі царкоўнай і бытавой традыцый.

Прынцып захавання скіраваны на кансервацыю літургічнага канона ў царкоўнай традыцыі і нязменнасць яго тлумачэння ў бытавой традыцыі. Пасхальная царкоўная традыцыя захоўвае ўстойлівасць канона. Бытавая традыцыя трактуе літургічныя каноны ў свабоднай форме, зразумелай і даступнай па змесце і мастацкаму праяўленню вобраза. Прынцып захавання пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый выяўляецца ў строгім ваканнанні і падпарадкаванні структуры пасхальнага цыклу (Вялікі пост, пасхальны Трыдыум, святочны пасхальны перыяд). Кананічная структурнасць сучаснага пасхальнага цыклу не парушана ні ў царкоўнай, ні ў бытавой традыцыі. Таксама нязменнымі застаюцца і галоўныя атрыбуты пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцыі (крыж, свечка (агонь), вада, галінка вярбы). Каларыстыка пасхальных святкаванняў захоўвае нязменны прыярытэт чырвонага колеру (чырвоны колер ў аздабленні храма, адзенні літургічнай службы і святара, фларыстычных кампазіцыях, фарбаванні пасхальных яек, упрыгожваннях святочных сталоў). Праяўленнем захавання канона можа выступаць працэс "абвяшчэння ўсяму свету" аб уваскрасенні Хрыста. У царкоўнай традыцыі гэта адбываецца ў момант ранішняй Рэзурэкцыйнай працэсіі (ад лац. "Resurrectio" – "Уваскрасенне"); паводле бытавой традыцыі – у першы пасхальны дзень

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вернікі здзяйсняюць урачысты абыход двароў, дамоў з песнямі, у якіх абвяшчаюць аб Уваскрасенні.

Прынцып замяшчэння заснаваны на адносінах паміж з’явамі, аднолькавымі па сутнасці, але рознымі па функцыях, якія яны выконваюць. Гэтыя з’явы ў працэсе ўзаемаадносін могуць набываць агульныя рысы і з цягам часу замяняць адна адну. Прынцып замяшчэння дзейнічае ў адносінах рэпертуара. Напрыклад, першакрыніцай многіх рэлігійна-бытавых песень з’яўляецца грыгарыянскі харал. Так, у спевах “Хрыстус Пан, паўстаўшы з гробу, аллелюя!”, “Хрыстос уваскрос” мелодыка грыгарыянскага харалу пад уплывам фальклорнага вербальнага тэксту паступова спрашчалася, рытмізавалася і, страціўшы характэрныя рысы літургічных спеваў, ператваралася ў бытавую рэлігійную песню з сілабічным паэтычным тэкстам. Бытавыя рэлігійныя песні сталі часткай літургічнай спеўнай практыкі, замяніўшы традыцыйны грыгарыянскі харал. Узаемадзеянне царкоўнай і бытавой традыцый праз прынцып замяшчэння дэманструе іх гнуткасць. Царкоўная і бытавая традыцыі знаходзяцца нібы ў памежным стане, калі значэнне і функцыі адной традыцыі плаўна пераходзяць у другую.

Прынцып інтэграцыі адлюстроўвае зліццё ў адзінае цэлае раней дыферэнцаваных элементаў, што прыводзіць да новых якасных магчымасцяў гэтай каштоўнасці, а таксама да змены ўласцівасцяў саміх элементаў. Пацвярджэннем узаемадзеяння пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый праз прынцып інтрэграцыі з’яўляецца вынік параўнання характэрных асаблівасцяў гэтых традыцый. Прынцып інтэграцыі ўзаемадзеяння пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый у большай ступені праяўляецца ў дачыненні да вымаўлення паэтычных тэкстаў рэлігійных песень, асабліва, калі песні спяваюцца на памяць. У такім выпадку спевы часцей не выконваюцца ў адпаведнасці з правіламі беларускай літаратурнай мовы, а вымаўленне паэтычнага тэксту песні паддаецца “дэфармацыі” (напрыклад, некаторыя словы могуць замяняцца на сінонімы або проста трансфармавацца і пераўтварацца ў новыя дыялектычныя выразы). Такога кшталту змяненні адбываюцца на “глебе” бытавой традыцыі, а потым, асіміляваўшыся, разам з песнямі або асобнымі трасфармацыйнымі элементамі вымаўлення, пранікаюць на музычную “прастору” царкоўнай традыцыі. Прынцып інтэграцыі царкоўнай і бытавой традыцый выяўляецца ў дадзеным выпадку праз вербальную мову.

***У падраздзеле 3.2 “Сінтэз мастацтваў у сучаснай пасхальнай рымска-каталіцкай традыцыі”*** акцэнтуецца ўвага на суадносінах відаў мастацтва, якія выкарыстоўваюцца ў рамках пасхальнага набажэнства і бытавых пасхальных абрадах. Сродкі выразнасці музычнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога, тэатральнага мастацтваў у пасхальнай традыцыі раскрываюць пэўны сэнс той ці іншай падзеі Святога Пісання пры дапамозе сімвалаў.

Сінтэз мастацтваў у сучаснай пасхальнай традыцыі найбольш яскрава праяўляецца ў рымска-каталіцкай літургіі. Сучасная рымска-каталіцкая пасхальная царкоўная і бытавая традыцыі кангламеруюць вакол сябе царкоўны канон (асноўныя царкоўныя правілы), рытуал (устаноўлены парадак здзяйснення набажэнства), абрадавыя дзеянні (сукупнасць сімвалічных дзеянняў, як супольнасці так і святара), храмавую прастору (унутранае ўбранства храма, дэкор), архітэктуру храма ў ансамблі з жывапісам і скульптурай, музыку (вакальную і інструментальную), тэатралізацыю (візуалізацыю набажэнстваў), кампаненты бытавой творчасці (вышыванкі, рушнікі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абрусы). Першым і галоўным ўвасабленнем хрысціянскага канона ў літургіі з'яўляецца "слова" (Біблія, Евангелле, рэлігійная літаратура). Слова спалучаецца з музыкай і напаўняецца больш глыбокімі сродкамі выразнасці, якія дапамагаюць людзям паглыбіцца ў рэлігійны сэнс набажэнства. Вобразнае праяўленне слова знаходзіць у творах рэлігійнага выяўленчага мастацтва.

Адным з кампанентаў пасхальнага мастацкага сінтэзу з'яўляецца візуалізацыя літургічнага дзеяння. Візуалізацыя ў рамках набажэнства не існуе самастойна, яна суправаджаецца вербальным тэкстам, які ўспрымаецца спачатку слыхам, зрокам, а потым – свядомасцю чалавека, і знаходзіць адлюстраванне ў пластычнай сімвалізацыі цырымоніі. Сінтэз мастацтваў у пасхальным набажэнстве заключаецца ў спалучэнні рытуальных дзеянняў падчас набажэнства, што праяўляецца ў пластыцы літургіі (напрыклад, сімволіка паклона, благаслаўлення, знака крыжа і інш.) і непасрэдна самаго сцэнарыя набажэнства (напрыклад, драматургія літургічнага дзеяння: пралог (уваход літургічнай працэсіі), кульмінацыя (літургія Эўхарыстыі), заключэнне (благаслаўленне і выхад літургічнай службы з храма).

У сучаснай пасхальнай рымска-каталіцкай царкоўнай і бытавой традыцыях акрамя агульнага мастацкага сінтэзу (музыка, паэзія, тэатр, дызайн, жывапіс) існуе прыватны сінтэз, які існуе паміж жанрамі ўнутры аднаго віда матацтва, напрыклад у музыцы. Музычная поліжанравасць пасхальнага мастацтва паўстае ў выглядзе сукупнасці спалучэнняў супрацьлеглых кірункаў творчасці: спалучэнне старажытных музычных жанраў з сучаснымі – старажытнага грыгарыянскага харалу або паліфаніі рэнесансу з сучаснай паліфаніяй ці гармоніяй (напрыклад, на інструментальную паліфанічную кампазіцыю Дж. Палестрыны кампазітар М. Скуратовіч стварыла паэтычны тэкст і адаптавала старажытную мелодыю ("Аллелюя! Узрадуйцеся"); сінтэз гучання акустычных інструментаў і электронных; спалучэнне бытавога і царкоўнага музычнага рэпертуару; спалучэнне прафесійнага і аматарскага выканальніцтва.

***У падраздзеле 3.3 "Пераемнасць традыцый і іх абнаўленне ў царкоўным і бытавым пасхальным мастацтве"*** адзначаецца, што традыцыя ўвесь час развіваецца за кошт стварэння новых форм творчай дзейнасці ў пасхальнай абраднасці. У пасхальным мастацтве тэкстатворнымі фактарамі з'яўляюцца літургічны канон і традыцыя. Пераемнасць традыцый рымска-каталіцкай мастацкай спадчыны праяўляецца праз літургічны музычны рэпертуар, творы выяўленчага мастацтва. Абнаўленне традыцый звязана з мастацкімі патрэбамі і густамі сучасных вернікаў, што адлюстроўваюць як самі царкоўныя каноны, так і іх узаемадзеянне з бытавой (фальклорнай) традыцыяй (напрыклад, выкананне пасхальнага лацінскага гімна ў фальклорнай манеры). У сучасны перыяд адбываецца абнаўленне пасхальнай мастацкай рымска-каталіцкай традыцыі. Пасхальны сюжэт і яго ўвасабленне ў вербальных тэкстах і мастацкіх творах стабільны, а музычныя тэксты і мастацкія вобразы абнаўляюцца.

Абнаўленне пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый звязана з асаблівасцю інтэрпрэтацыі пасхальнага сюжэту ў розных відах сучаснага рэлігійнага мастацтва. Напрыклад, увядзенне ў літургічную музычную практыку дадатковых (акрамя аргана) музычных інструментаў (гітары, ударных інструментаў, цымбалаў і інш.), узбагачэнне інтанацыйнай выразнасці меладычных ліній і акордавых сугуччаў літургічных кампазіцый, выкарыстанне нестандартна пабудаваных мастацкіх вобразаў (напрыклад, жывапісны твор М. Ермашкевіча "І Слова сталася Целам" (лац."Et verbum caro factum

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

est”), дзе кананічны вобраз увасабляецца праз два мастацкія стылі: барока з яго кантраснасцю, напружанасцю, дынамічнасцю вобразаў, сумяшчэннем рэальнасці і ілюзіі, а таксама рэалізму, што праяўляецца ў рэальнай трансляцыі знешняга выгляду асобаў, прадстаўленых на карціне).

Сучасная царкоўная і бытавая спеўныя практыкі патрабуюць асаблівага спосабу выканання (інтэрпрэтацыі) рэлігійнай музыкі. Інтэрпрэтацыя бытавой рэлігійнай музыкі, і, досыць часта, царкоўнай, калі яна выконваецца парафіянамі-аматарамі без кіраўніцтва кантара, можа паўставаць у якасці фалькларызмаў, якія падзяляюцца на тыпы: стылізацыя, мадэрнізацыя, імітацыя, рэстаўрацыя. Рымска-каталіцкая традыцыя ў вакальным выканальніцтве прадстаўлена трыма асноўнымі групамі спевакоў: людзьмі сталага пакалення, сярэднягя ўзросту, моладзі і дзяцей, кожнай з якіх характэрна свая асаблівая спеўная манера.

У сучасны перыяд адбываецца абнаўленне пасхальнай мастацкай рымска-каталіцкай традыцыі і датычыцца яно, у асноўным, выканальніцкай практыкі: спеўнай манеры, рэпертуару (прэферэнцыі мае польская рэлігійная музыка ў перакладзе на беларускую мову – “Вітай Пажытку” П. Бэмбэнка, “З радасцю ўсклікні” Д. Куша і інш.). Практыка выканання аўтарскіх музычных твораў, стылізаваных або аранжыраваных твораў у набажэнствах паступова аддаляе ўдзел у спевах вернікаў. У парафіях, дзе існуюць харавыя калектывы, асноўная маса парафіян спявае толькі галоўныя часткі Імшы (“Пане, змілуйся над намі”, “Хвала на вышынях Богу”, “Ойча наш”, “Баранак Божы”).

Абнаўленне традыцый у царкоўным і бытавым пасхальным мастацтве адбываецца праз яго новыя формы існавання, такія як спецыяльныя пасхальныя фестывалі-конкурсы (“Дастукацца да нябёсаў”, “Магутны Божа”), музычная майстэрня ў г. п. Івянец, моладзевыя чуванні, дзіцячыя і аматарскія хоры з разнастайным пасхальным рэпертуарам, тэатральныя і інш. гурткі, якія спрыяюць развіццю пасхальнай традыцыі. На эстраду беларускай рэлігійнай музыкі, прысвечанай усім перыядам літургічнага каляндара, у тым ліку і Пасхі, выходзяць сучасныя моладзевыя гурты (“Адзіныя ў Духу”, “Міласць”, “Небасхіл”, “Подых Духа”, “AVE”, “Laudans”, “Tesaurus”, “+ 9”), створаныя, у большай ступені, пад апекай рымска-каталіцкіх парафій.

Пра пераемнасць і абнаўленне пасхальнай мастайкай традыцыі сведчыць шырокі факталагічны матэрыял (літургічныя, пазалітургічныя і бытавыя песні: запісана 286 кампазіцій); прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: зафіксаваны ў фота фармаце; выяўлены ўсе магчымыя абразы, прысвечаныя пасхальнай тэматыцы), сабраны падчас экспендыцыі па парафіях (экспедыцыі праведзены ў 32 парафіі) рымска-каталіцкіх дыяцэзій Беларусі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі даследавання

У выніку праведзенага даследаванння выяўлены асаблівасці развіцця рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый у Беларусі, раскрыта спецыфіка іх гістарычнага і сучаснага функцыянавання, вызначаны асноўныя прынцыпы ўзаемадзеяння пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый у творах мастацтва; зроблены наступныя высновы:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Рымска-каталіцкая пасхальная традыцыя – гэта трывалы мастацка-культурны комплекс, які знаходзіцца ў стане пастаяннага развіцця: назапашвае характэрныя асаблівасці, уласцівыя ёй (традыцыі), мінулых пакаленняў, укараняе іх (асаблівасці) ва ўмовы сучаснага жыцця, рэлігійнай практыкі грамадства і ў наступстве выпрацоўвае новыя традыцыі. Рымска-каталіцкая пасхальная традыцыя насычана шматлікай хрысціянскай сімволікай і евангельскімі вобразамі, якія знайшлі сваё ўвасабленне амаль ва ўсіх відах мастацтва, як у царкоўнай сферы, так і ў бытавой. Беларуская рымска-каталіцкая пасхальная традыцыя грунтуецца на агульнахрысціянскіх ідэях, якія ўвасабляюцца ў сімвалах, праяўляюцца ў кананічных тэкстах (вербальных і музычных) і выяўляюцца ў мастацтве, прысвечаным пасхальнай тэматыцы. Рымска-каталіцкая пасхальная традыцыя мае прамую ўзаемасувязь з рэлігійным мастацтвам. Мастацтва стварае і перадае сацыякультурны вопыт, а мастацкая традыцыя назапашвае, захоўвае і перадае мастацкі вопыт, з'яўляючыся змястоўна-структурным канцэнтратам, які застаецца, дзейснай часткай мінулага.

Станаўленне беларускай рымска-каталіцкай пасхальнай традыцыі адбывалася ў кантэксце тысячагадовага культурна-гістарычнага развіцця краіны пад вялікім уплывам польскага рэлігійнага мастацтва [3; 8; 10; 11; 15].

2. Рымска-каталіцкая пасхальная музычная традыцыя грунтуецца на кананічных тэкстах Святога Пісання (у бытавой традыцыі мае варыяцыйны характар), з'яўляецца іх вобразным увасабленнем і па значнасці пераўзыходзіць усе іншыя віды рэлігійнага мастацтва ўнутры літургічнага дзеяння. Генезіс пасхальнага музычнага комплексу царкоўнай традыцыі звязаны з фарміраваннем рымска-каталіцкага пасхальнага набажэнства.

Літургічная кананічная форма цыклу пасхальных набажэнстваў (Вялікі пост, пасхальны Трыдыум і пасхальная Актава) з'яўляецца структурнай і змястоўнай мадэллю пасхальных абрадаў у бытавой мастацкай традыцыі, якія маюць глыбокія гістарычныя карані. На фарміраванне і развіццё рэлігійнага музычнага мастацтва ў значнай ступені паўплывалі сацыяльна-культурныя фактары, што ў наступстве стала імпульсам для стварэння і распаўсюджвання рэлігійнага рэпертуару.

Рымска-каталіцкая пасхальная музычная традыцыя ўключае ў сябе літургічную музыку (прадстаўлена жанрамі мессы (як музычны твор), секвенцыі, рэспансорыя, псальма); пазалітургічную музыку (прадстаўлена жанрамі рэлігійнай песні, канта); бытавую музыку (прадстаўлена жанрамі духоўнага верша, поставай песні, валачобнай песні, пасхальнага песнапення). Комплекснае вывучэнне рэлігійных музычна-паэтычных жанраў дае права лічыць іх адным з важных фрагментаў музычна-гістарычнага зрэзу агульнаеўрапейскай і ўсходнеславянскай культур [4; 5; 6; 14;15; 19].

3. Рымска-каталіцкая пасхальная царкоўная і бытавая традыцыі заснаваны на мастацкай творчасці яго суб'ектаў, што выяўляецца ва ўзаемадзеянні абедзвюх складовых частак традыцыі на аснове дзеяння прынцыпаў захавання, замяшчэння і інтэграцыі. Прынцып захавання ўказвае на інварыянтнасць канона ў літургічнай пасхальнай традыцыі і яго варыянтнасць у бытавой традыцыі; выяўляецца праз нязменныя літургічныя тэксты ў царкоўнай традыцыі і агульны пасхальны сюжэт (у музычным, выяўленчым і тэатральным мастацтве), аднолькавыя формы рытульных дзеянняў (валачобны абрад, гульні з велікоднымі яйкамі, біццё вербай і інш.) у бытавой

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

традыцыі. Прынцып замяшчэння пабудаваны на адносінах паміж падобнымі прадметамі, дзе кожнае пераўтварэнне аднаго прадмета або пераход аднаго дзеяння ў другое, грунтуецца на аднолькавай сутнасці, але на розных функцыях прадмета, якія ў выніку могуць дапаўняцца і замяняцца. Прынцып замяшчэння ў адносінах узаемадзеяння царкоўнай і бытавой традыцый можа праяўляцца на прыкладзе замяшчэння рэпертуару. Так, бытавыя рэлігійныя песні сталі часткай літургічнай пеўчай практыкі, выцесніўшы з яе традыцыйны грыгарыянскі харал. Прынцып інтэграцыі з’яўляецца асноўным ва ўзаемадзеянні рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый і каардынуе яго ў двух галоўных напрамках: пранікненні элементаў бытавой творчасці ў царкоўную практыку і, наадварот, насычэнні бытавой творчасці элементамі царкоўнай мастацкай практыкі. Прынцып інтэграцыі ва ўзаемадзеянні царкоўнай і бытавой традыцый прасочваецца на падставе жанраўтварэння, структурна-кампазіцыйнай будовы (структуру пасхальнага набажэнства бытавая традыцыя паўтарае ў адаптаванай форме), інтанацыйнай будовы (напрыклад, аднолькавы вербальны тэкст пасхальнага канта мае варыятыўнае меладычнае афармленне ў царкоўнай і бытавой традыцыях) [1; 2; 12].

4. Спецыфіка адносін паміж пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцыямі заснавана на ўнутраным узаемадзеянні розных відаў мастацтва. Паняційна-тэрміналагічнае, вобразна-семіятычнае і сюжэтнае адзінства музычнага, тэатральнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтваў, якія складаюць аснову рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый, заснаваны на іх вобразна-асацыятыўным, акустычным і аптычным падабенстве.

Сучасная рымска-каталіцкая мастацкая практыка характарызуецца імкненнем да абнаўлення традыцый шляхам стварэння новых формаў творчай дзейнасці ў пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцыях (спецыяльныя набажэнствы, канцэрты, фестывалі, чуванні, тэатральныя пастаноўкі, выставы твораў мастацтва на пасхальную тэму і інш.), у якіх мае патрэбу сучаснае грамадства [1; 7; 8; 10; 11; 13; 16; 17; 18; 19].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў даследавання**

Вынікі і матэрыялы дысертацыйнага даследавання ўкаранёны: у музычна-творчы працэс прыходаў (Маці Божай Міласэрнасці (Вострабрамскай) в. Бярозаўка Віцебскай дыяцэзіі, Святога Яна Хрысціцеля в. Валкалаты Віцебскай дыяцэзіі, Святой Тройцы г. Докшыцы Віцебскай дыяцэзіі); адукацыйна-асветніцкі працэс Беларускай Кустодыі Ордэна Братоў Меншых Капуцынаў імя блажэннага Ганарата Казмінскага; адукацыйны працэс установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” пры выкладанні вучэбных дысцыплін “Гісторыя мастацтваў: музыка” і “Пастаноўка голасу”; вучэбны працэс дзяржаўнай установы адукацыі “Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі” пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны “Вакальна-харавое выканальніцтва”; музычна-творчай дзейнасці літургічных хораў прыходаў (Святога Казіміра в. Ліпнішкі Гродненскай дыяцэзіі, Святога Андрэя г. Слоніма Гродненскай дыяцэзіі, Святога Францішка г. Мінска Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі), пра што сведчаць 10 актаў аб практычным выкарыстанні вынікаў НДР ад 25.03.2012, 15.04.2012, 16.09.2012, 24.01.2014, 10.06.2014, 10.02.2016, 22.03.2016, 19.09.2016, 29.10.2016, 27.12.2016.

Матэрыялы, якія змяшчаюцца ў дысертацыі, могуць быць уключаны ў вучэбныя курсы па гісторыі і тэорыі мастацтва, харазнаўства, у практычныя курсы “Пастаноўка

голасу”, “Вакальна-харавое майстэрства” вышэйшых і сярэдніх вучэбных устаноў Рэспублікі Беларусь, а таксама ў курсы сумежных дысцыплін – фалькларыстыкі, энтамузыкалогіі, культуралогіі, што дае магчымасць пераадолець рамкі вузкай спецыялізацыі і сфарміраваць спецыяліста з шырокім светапоглядам. Таксама матэрыялы навуковай працы могуць знайсці прымяненне пры падрыхтоўцы курсаў павышэння кваліфікацыі спецыялістаў у галіне культуры і адукацыі. Асаблівая практычная значнасць вынікаў дысертацыйнага даследавання можа быць вызначана скіраванасцю на папаўненне айчыннай мастацтвазнаўчай базы дадзеных аб развіцці заходняга мастацтвазнаўства за кошт упершыню апрацаваных і перакладзеных на беларускую мову іншамоўных матэрыялаў і выкарыстання прапанаваных дадзеных для тэарэтычнай часткі наступных навуковых даследаванняў па спецыяльнасці 17.00.09 – тэорыя і гісторыя мастацтваў.

Матэрыялы, сабраныя падчас фальклорных экспедыцый, могуць стаць асновай для арганізацыі архіва аўдыё- і відэаматэрыялаў – артэфактаў бытавой культуры рымска-каталіцкай традыцыі. Прадстаўленыя ў працы выявы абразоў і іх апісанне, могуць быць карыснымі мастацтвазнаўцам і культуролагам, музеязнаўцам, пры выкарыстанні іх (абразоў) у розных галінах навукі ў якасці нагляднага матэрыялу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

## Артыкулы ў навуковых рэцэнзаваных выданнях

1. Раманенкава, В. І. Кампаненты рэлігійна-бытавой традыцыі ў Рымска-каталіцкай культуры беларусаў / В. І. Раманенкава // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2014. – № 1 (21). – С. 73–77.

2. Раманенкава, В. І. Прыярытэтныя вектары функцыянавання пасхальнай музычнай культуры рымска-каталіцкай традыцыі на Беларусі / В. І. Раманенкава // Роднае слова. – 2014. – № 11. – С. 90–92.

3. Раманенкава, В. І Рэлігійныя музычна-паэтычныя жанры як феномен традыцыйнай рымска-каталіцкай культуры на Беларусі / В. І. Раманенкава // Искусство и культура. – 2014. – № 4. – С. 62–65.

## Артыкулы ў навуковых зборніках

4. Раманенкава, В. І. Беларускі фальклор у рымска-каталіцкай літургіі праз прызму стагоддзяў / В. І. Раманенкава // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзельнікаў VI Міжнар. навук. канф. (Мінск, 27–29 красавіка 2012 г.) / БДУКМ; рэдкал. : Мажэйка М. А. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 79–81.

5. Раманенкава, В. І. Музычнае мастацтва Рымска-каталіцкай царквы: захаванне традыцыі на Докшыччыне / В. І. Раманенкава // Культура: открытый формат – 2012 : (библиотековедение, библиографоведение и книговедение, искусствоведение, культурология, музееведение, социокультурная деятельность): сб. науч. ст. / Белорусский государственный университет культуры и искусств; [сост. : Т. Н. Бабич, Ю. А. Переверзева, Е. Н. Шаройко; науч. ред. М. А. Можейко].– Минск, 2012. – С. 26–30.

6. Раманенкава, В. І. Інтэрпрэтацыя рэлігійнага фальклору ў музычнай практыцы Рымска-каталіцкай царквы на Беларусі / В. І. Раманенкава // Сучасны культурны працэс: праблемы, перспектывы, метады даследавання: XXXVII навуковая канферэнцыя студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў: зб. навук. артыкулаў (Мінск, 18–19 красавіка 2012 г.). – Мінск, 2012. – С. 161–166.

7. Раманенкава, В. І. Паняцце і змест музычнай Пасхальнай рымска-каталіцкай традыцыі / С. І. Раманенкава // Культура: открытый формат – 2014 (библиотековедение, библиографоведение и книговедение, искусствоведение, культурология, музееведение, социокультурная деятельность): сб. науч. ст. / М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств; [сост. : Т. Н. Бабич, Ю. А. Переверзева; ред. сов. : В. Р. Языкович (председатель) и [др.]]. – Минск, 2014. – С. 49–53.

8. Раманенкава, В. І. Muzyczny folklor religijny na Białorusi – kontekst lokalny / В. І. Раманенкава // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзельнікаў VIII Міжнар. навук. канф. (Мінск, 25–27 крас. 2014 г.) / БДУКМ ; рэдкал. : Языковіч В. Р. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 54–56.

9. Раманенкава, В. І. Асаблівасці бытавання пасхальнай музычнай традыцыі Рымска-каталіцкай царквы ў сучасным фальклоры / В. І. Раманенкава // Аўтэнтычны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання (памяцi антраполага Зiнаiды Мажэйка): зб. навук. прац удзельнiкаў IX Мiжнар. навук. канф. (Мiнск, 24–26 красавiка 2015 г.) / БДУКМ ; рэдкал. : Языковiч В. Р. (адк. рэд.) [i iнш.]. – Мiнск, 2015. – С. 79–81.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

10. Раманенкава, В. І. Стылявое ўвасабленне грыгарыянскага харала ў літургічнай практыцы / В. І. Раманенкава // Христианство в Европе: взгляд в прошлое или путь в будущее: материалы междунар. студ. конф.-семинара (г. Минск, 10–11 декабря 2010 г.) / [сост. Г. Н. Петровский]. – Минск: Ковчег, 2010. – С. 193–196.

11. Раманенкава, В. І. Захаванне і адраджэнне рэлігійнай народнай традыцыі на Беларусі / В. І. Раманенкава // Культура. Наука. Творчество: [Вып.] 4 : материалы IV Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 20–23 апреля 2010 г. / [науч. ред. С. П. Винокурова]. – Минск, 2011. – Вып. 4. – С. 462–465.

12. Раманенкава, В. І. Рэлігійныя песні і інтэрпрэтацыя ў музычным асяроддзі Рымска-каталіцкай царквы / В. І. Раманенкава // Культура. Наука. Творчество : Вып. 5 : [материалы V Междунар. науч.-практ. конф. «Культура. Наука. Творчество» (27–28 апреля 2011 г.) / научный редактор Н. О. Арутюнова]. – Минск, 2011. – Вып. 5. – С. 392–398.

13. Раманенкава, В. І. Сучасная музычная творчасць моладзі на Віцебшчыне, як сродак прадаўжэння каляднай традыцыі / В. І. Раманенкава // Актуальные проблемы мировой художественной культуры: материалы Междунар. науч. конф., посвященной памяти профессора У. Д. Розенфельда, Гродно, 5–6 апреля 2010 г. : в 2 ч. Ч. 1 / Гродненский гос. ун-т им. Я. Купалы ; ред. кол. : Т. Г. Барановская, Р. Л. Левина, И. Ф. Двужильная [и др.]. – Гродно, 2011. – С. 141–144.

14. Раманенкава, В. І. Традыцыі даследавання нелітургічнай музычнай спадчыны рымска-каталіцкай царквы XIX – пач. XXI стагоддзяў / В. І. Раманенкава // Актуальные проблемы мировой художественной культуры: материалы Междунар. науч. конф., посвященной памяти профессора У. Д. Розенфельда, Гродно, 5–6 апреля 2012 г. : в 2 ч. Ч. 2 / Гродненский гос. ун-т им. Я. Купалы ; ред. кол. : Т. Г. Барановская, Р. Л. Левина, И. Ф. Двужильная [и др.]. – Гродно, 2012. – С. 325–330.

15. Раманенкава, В. І. Увасабленне сучасных форм бытавой мастацкай культуры рымска-каталіцкай традыцыі на Беларусі / В. І. Раманенкава // Христианство и общество (к 1700-летию Миланского эдикта): материалы Междунар. науч. конф., 17 мая 2013 г., Барановичи, Респ. Беларусь / редкол.: А. В. Никишова (гл. ред.), А. В. Димидович (отв. ред.), З. Н. Козлова [и др.] – Барановичи, 2013. – С. 156–158.

16. Раманенкава, В. І. Пасхальная музычная спадчына рымска-каліцкай царквы на Беларусі як аб'ект традыцыйнай культуры / В. І. Раманенкава // Культура. Наука. Творчество: [Вып.] 8: VIII Междунар. науч.-практ. конф. (Минск, 15 мая 2014 г.) / [редкол. : В. М. Черник (председ.) и др.]. – Минск, 2014. – Вып. 8. – С. 214–218.

17. Раманенкава, В. І. Традыцыйная рэлігійная музыка рымска-каталіцкай царквы ў заканадаўчых і прававых дакументах / В. І. Раманенкава // Матэрыялы XX Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытанняў, прысвечаных Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 20–23 мая 2014 г.) / Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал. : В. Р. Языковіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 207–212.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

18. Романенкова В. И. Żywa tradycja muzyki religijnej na ziemi Dokszyckiej / В. И. Романенкова // Актуальные проблемы мировой художественной культуры : материалы VII междунар. науч. конф., посвящ. памяти проф. У. Д. Розенфельда (Гродно, 16–17 окт. 2014 г.). В 2 ч. Ч. 1 / ГрГУ им. Я. Купалы; редкол. : Т. Г. Барановская (гл. ред.) [и др.]. – Гродно, 2015. – С. 259–264.

19. Раманенкава, В. І. Эксплікацыя велікоднай музычнай традыцыі ў бытавым асяроддзі Рымска-каталіцкай Царквы ў Беларусі / В. І Раманенкава // Навуковы пошук у сферы культуры і мастацтва: інавацыйныя падыходы : матэрыялы навук. канф. прафесарска-выкладчыцкага складу, прысвеч. 40-годдзю заснавання Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў, Мінск, 25 лістап. 2015 г. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал. : Ю. П. Бондар (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2017. – С. 343–348.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Р Э З Ю М Э

РАМАНЕНКАВА ВЕРАНІКА ІВАНАЎНА

## РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЯ ПАСХАЛЬНАЯ ЦАРКОЎНАЯ І БЫТАВАЯ ТРАДЫЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ: МАСТАЦТВАЗНАЎЧАЯ РЭКАНСТРУКЦЫЯ

**Ключавыя словы:** царкоўная традыцыя, бытавая традыцыя, пасхальная традыцыя, літургічнае мастацтва, пасхальны Трыдыум, Імша, іканапіс, дэкор, пазалітургічнае мастацтва, кант, рэлігійная песня, рэлігійны фальклор, тэатралізацыя, валачобныя песні.

**Мэта даследавання** – выявіць асаблівасці развіцця рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой  традыцый у Беларусі.

**Метады даследавання** грунтуюцца на комплексным падыходзе да рымска-каталіцкай царкоўнай і бытавой традыцый як цэласнага аб’екта. Сярод прыярытэтных метадаў даследавання – сістэмны, гістарыяграфічны, культуралагічны, мастацтвазнаўчы, кампаратыўны. У стварэнні эмпірычнай базы даследавання выкарыстаны метады палявых даследаванняў.

**Вынікі даследавання і іх навуковая навізна.** Упершыню ў мастацтвазнаўстве здзейснена мастацтвазнаўчая рэканструкцыя асаблівасцяў развіцця рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый у Беларусі. Унёсак саіскальніка заключаецца ў асэнсаванні праблемы ўзаемадзеяння рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцый у Беларусі. Рымска-каталіцкая пасхальная царкоўная і бытавая традыцыі ахарактарызаваны ў агульных і асаблівых сваіх праявах. Раскрытыя асаблівасці развіцця рымска-каталіцкай царкоўнай і бытавой пасхальных традыцый у дыялектычнай узаемаабумоўленасці складаючых яе элементаў. Уведзеныя ў навуковы ўжытак новыя друкаваныя, архіўныя, наратыўныя матэрыялы і крыніцы, а таксама новы факталагічны матэрыял, які адлюстроўвае працэс інтэграцыі мастацтваў у сучаснай рымска-каталіцкай пасхальнай царкоўнай і бытавой традыцыях.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні.** Практычная значнасць атрыманых вынікаў заключаецца ў магчымасці іх прымянення ў розных курсах па гісторыі мастацтва і культуры, фалькларыстыцы; пры распрацоўцы навучальных праграм і вучэбна-метадычных дапаможнікаў.

Вынікі дысертацыйнага даследавання магчыма выкарыстоўваць пры падрыхтоўцы і выкладанні мастацтвазнаўчых дысцыплін у сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах Беларусі. Яны могуць быць уключаныя ў курсы сумежных дысцыплін – культуралогіі, гісторыі, рэлігіязнаўства.

Навуковыя палажэнні і высновы дысертацыі спрыяюць пашырэнню праблемнага поля сучаснага мастацтвазнаўства; могуць стаць асновай для далейшых мастацтвазнаўчых, сацыякультурных, гістарычных і рэлігіязнаўчых навуковых даследаванняў.

**Вобласць прымянення:** мастацтвазнаўства, фалькларыстыка, этнамузыкалогія, культуралогія, гісторыя беларускага мастацтва, рэлігіязнаўства, мастацкая адукацыя, музычная практыка.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Р Е З Ю М Е**

РОМАНЕНКОВА ВЕРОНИКА ИВАНОВНА

**РИМСКО-КАТОЛИЧЕСКАЯ ПАСХАЛЬНАЯ ЦЕРКОВНАЯ И БЫТОВАЯ ТРАДИЦИИ В БЕЛАРУСИ: ИСКУССТВОВЕДЧЕСКАЯ РЕКОНСТРУКЦИЯ**

**Ключевые слова:** церковная традиция, бытовая традиция, пасхальная традиция, литургическое искусство, пасхальный Тридиум, Месса, иконопись, декор, внелитургчеое искусство, кант, религиозная песня, религиозный фольклор, театрализация, волочебные песни.

**Цель исследования** – выявить особенности развития римско-католической пасхальной церковной и бытовой традиций в Беларуси.

**Методы исследования** базируются на комплексном подходе к римско-католической церковной и бытовой традиции как целостному объекту. Среди приоритетных методов исследования – системный, историографический, культурологический, искусствоведческий, компаративный. В создании эмпирической базы исследования использованы методы полевых исследований.

**Результаты исследования и их научная новизна.** Впервые в искусствоведческой науке осуществлена искусствоведческая реконструкция особенностей развития римско-католической пасхальной церковной и бытовой традиций в Беларуси. Вклад соискателя заключается в осмыслении проблемы взаимодействия римско-католической пасхальной церковной и бытовой традиций в Беларуси. Римско-католическая пасхальная церковная и бытовая традиции охарактеризованы в общих и особенных своих проявлениях. Раскрыты особенности развития римско-католической пасхальной церковной и бытовой традиций в диалектической взаимообусловленности составляющих ее элементов. Введены в научный обиход новые печатные, архивные, нарративные материалы и источники, а также новый фактологический материал, отражающий процесс интеграции искусств в современной римско-католической пасхальной церковной и бытовой традициях.

**Рекомендации по использованию.** Практическая значимость полученных результатов заключается в возможности их применения в различных курсах по истории искусства и культуры, фольклористике; при разработке учебных программ и учебно-методических пособий.

Результаты диссертационного исследования предполагается использовать при подготовке и преподавании искусствоведческих дисциплин в средних специальных и высших учебных заведениях Беларуси. Они могут быть включены в курсы смежных дисциплин – культурологии, истории, религиоведении.

Научные положения и выводы диссертации способствуют расширению проблемного поля современного искусствоведения; могут стать основой для дальнейших искусствоведческих, социокультурных, исторических и религиоведческих научных исследований.

**Область применения:** искусствоведение, фольклористика, этномузыкология, культурология, история белорусского искусства, религиоведение, художественное образование, музыкальная практика.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## S U M M A R Y

RAMANENKAVA VERANIKA

### THE ROMAN CATHOLIC CHURCH AND THE HOUSEHOLD EASTER TRADITION IN BELARUS: ART CRITICISM RECONSTRUCTION

**Keywords:** church tradition, household tradition, Easter tradition, liturgical art, Easter Tridium, Mass, icon painting, decor, outside liturgical art, chant, religious song, religious folklore, theatrical.

**The purpose of research** – reveal features the development of the church and household Easter Roman Catholic tradition in Belarus

**Research methods** are based on an integrated approach to the Roman Catholic church and household traditions as an integral object. Among the priority research methods are systemic, historiographical, culturological, art criticism, comparative. In the development of the empirical base of the research field research methods were used.

**The results obtained and their novelty.** For the first time in art criticism implement an art history reconstruction of the peculiarities of the development of the Roman Catholic church and household Easter tradition in Belarus was carried out. Contribution of the applicant consists in understanding the problem of interaction between church and household Roman Catholic Easter traditions in Belarus. Attributed and characterized by the Roman Catholic Church and household Easter tradition in their general and special manifestations. The revealed of the features development of the Roman Catholic Church and household Easter tradition are revealed in the dialectical interdependence of its constituent elements. Introduced in scientific terms a new printed, archival, narrative materials and sources, and also a new factual material reflecting the process of integrating arts in the modern Roman Catholic Church and household Easter traditions.

**Results of research and scientific innovation.** Practical significance of the study's findings is the ability to use it in various art history courses and culture, folkloristics, in educational programmes and methodological tools development.

The findings are expected of the dissertation research to be used in teaching of art history in specialized and high schools of Belarus. They could be included in culturology, history, religiology courses.

Scientific provisions and conclusions of the dissertation findings serve to enhance field of modern art history and could be the base for further cultural, social, theological, historical researches

**The sphere of application:** art history, folklore, ethnomusicology, culturology, history of Belarusian art, science of religion, art education, music practice.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Навуковае выданне**

**РАМАНЕНКАВА ВЕРАНІКА ІВАНАЎНА**

# РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЯ ПАСХАЛЬНАЯ ЦАРКОЎНАЯ І БЫТАВАЯ ТРАДЫЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ: МАСТАЦТВАЗНАЎЧАЯ РЭКАНСТРУКЦЫЯ

***Аўтарэферат***

*дысертацыі на саісканне вучонай ступені*
*кандыдата мастацтвазнаўства*
*па спецыяльнасці 17.00.09 – тэорыя і гісторыя мастацтва*

Падпісана ў друк 29.08.2017. Фармат 60×84 1 /16
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,62. Ул.-выд. арк. 1,9. Зак. 297.
Наклад 60 асобнікаў.

УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
ЛП №02330/456 ад 23.01.2914.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ